НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

Беларусь,
твой народ
дачакаецца
Залацістага,
яснага дня!
М. Багдановіч.

№ 13 (125), КАСТРЫЧНІК 2011 ГОДА

http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна

ПОГЛЯД РЭДАКТАРА

## РУХ У СТАБІЛЬНАЕ ЖАБРАЦТВА

**Згодна афіцыйным дадзеным, заработная плата ў Беларусі значна павялічылася. Акрамя таго, у верасні работнікі бюджэтнай сферы і пенсіянеры атрымалі індэксацыю ў памеры 500 тысяч рублёў. Аднак высокія тэмпы росту цэн, высокая інфляцыя, абясцэньванне беларускага рубля прывяло да яшчэ большага падзення рэальных даходаў насельніцтва.**

Нягледзячы на тое, што 20 кастрычніка Нацыянальны банк Беларусі нарэшце ўніфікаваў валютны курс – адрапартаваў пра выхад рубля на адзіны курс (падцягнуўшы афіцыйны паказнік да рынкавага), рубель умацоўваецца толькі вонкава. Ілюзія ўмацавання рубля адбываецца за кошт штучнага тармажэння яго курса. Амаль цэлы тыдзень па выніках таргоў на Беларускай валютна-фондавай біржы курс рубля "плаваў" у межах ад 8520 рублёў да 8680 рублёў за даляр. Але чаму тады на фоне абяцанай уладамі стабілізацыі зноў пачалі імкліва расці кошты на тавары і паслугі?

Эканамісты тлумачаць проста: раней замежная валюта для набыцця лекаў, энергарэсурсаў і г. д. прадавалася па 5700 рублёў за даляр, дык пасля выхаду на адзіны курс усе імпартныя тавары ў рублёвым вымярэнні падскочылі ўдвая. Да прыкладу, той жа прыродны газ падаражэў аж на 50%. Але пры гэтым не толькі імпарцёры, але і беларускія вытворцы, у якіх высокая доля замежнай сыравіны і камплектуючых, вымушаны закладаць выдаткі ў кошт прадукцыі, што і стала прычынай чарговага вітка росту цэн.

Праўда, пакуль што павышаць камунальныя плацяжы ўлады баяцца, каб не вызваць у перадзімовы сезон масавую незадаволенасць насельніцтва. Але рост коштаў на паліва непазбежна прывядзе да павышэння коштаў на транспартныя паслугі. Апошняе пацягне за сабой ланцуговую рэакцыю ва ўсіх сферах эканомікі новы рост цэн – віток за вітком.

Адначасова пакупніцкая здольнасць долара за апошні год на айчынным рынку павялічылася. Як мяркуюць эксперты, гэта звязана з тым, што тэмпы дэвальвацыі апярэдзілі тэмпы інфляцыі. Адпаведна, на адзін долар беларусы могуць купіць сёння болей тавараў і паслуг, чым год таму. Але беларусы атрымліваюць заробкі не ў доларах, а ў рублях. І яны занепакоены набалелым пытаннем: а ці зможа беларускі рубель зноў вярнуць былую пакупніцкую здольнасць?

Тым не менш, рэальныя даходы насельніцтва працягваюць зніжацца. Так, налічаная зарплата бюджэтнікаў сур'ёзна павялічылася. У верасні сярэдняя зарплата настаўнікаў склала 2 мільёна 140 тыс. рублёў супраць 1 мільёна 530 тыс. рублёў у жніўні. Адпаведным чынам павялічылася і зарплата работнікаў аховы здароўя. Сярэдняя заработная плата лекараў у верасні склала 2 млн. 981,7 тыс рублёў (у жніўні – 2 млн. 453,8 тыс.рублёў). Насамрэч, рэальная заработная плата, разлічаная Нацыянальным статыстычным камітэтам з улікам росту спажывецкіх коштаў на тавары і паслугі знізілася ў параўнанні да снежня 2010 года ( у Віцебскай вобласці да 80,6%). Іншымі словамі, інфляцыя ў бягучым годзе аказалася вышэй тэмпаў росту намінальнай заработнай платы насельніцтва.

Вынікі сацыялагічныя апытанняў паказваюць, што пераважная большасць насельніцтва не верыць абяцанням урада і кіраўніка краіны. Людзі рыхтуюцца да горшай эканамічнай сітуацыі. Цярплівасці беларусаў можна толькі здзіўляцца.

Трэба памятаць, што пры інфляцыйнай мадэлі эканомікі багацеюць тыя, хто мае непасрэдны доступ да матэрыяльных рэсурсаў, размяркоўвае валюту і нерухомасць. Словам, багацеюць чыноўнікі і начальнікі, якія прыслужваюць рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. Найбольш церпяць ад інфляцыі: сярэдні слой, найманыя работнікі, пенсіянеры і студэнты.

За гады панавання рэжым абясцэніў рубель да долара ў 3100 разоў. Па ўсяму бачна, што бюракратычны рэжым будзе і надалей працягваць папулісцкую палітыку, якая прывядзе да яшчэ большага збяднення народных мас. Днямі віцэ-прэм'ер АнатольТозік ужо заявіў, што рост пенсій з 1 лістапада будзе даведзены да 20%. У сваю чаргу старшыня Нацбанка Беларусі Надзея Ермакова паведаміла, што ў пачатку наступнага года будзе запушчана ў абарот грашовая купюра наміналам у 200 тыс. рублёў. А гэта азначае, што эканоміку зноў будуць напампоўваць пустымі паперкамі.

Паводле меркаванняў экспертаў, у доларавым эквіваленце заробкі наўрад ці падымуцца. Попыт на валюту па-ранейшаму перавышае прапанову. Насельніцтва, атрымаўшы на рукі рублі, страецца хутчэй пазбавіцца ад іх – скупляе тавары і валюту. Пры гэтым недавер насельніцтва да нічым не забяспечанага беларускага рубля чамусці выклікае ў кіраўніцтва краіны гістэрыю. І Лукашэнка, і Ермакова з раздражненнем выказваліся пра тое, што маўляў, нармальнаму чалавеку валюта не патрэбна. Простыя людзі могуць спакойна абысціся ў паўсядзённым жыцці аднымі рублямі. Дарэчы, галоўны банкір Надзея Ермакова ў адным з інтэрв'ю прызналася, што палажыла на "кніжку" 30 мільёнаў рублёў. Дэвальвацыя яе не палохае. Але народ упарта не бярэ прыклад са сваіх кіраўнікоў і больш давярае амерыканскім далярам. Ну што рабіць, калі ўладзе не пашанцавала з народам?

**Аляксандр Шчамлёў.**

НАШЫ ТРАДЫЦЫІ

## СВЯТА Ў ГОНАР ЛЕПШЫХ ЖАНЧЫН-МАЦІ РАЁНА

**У шумілінскім ГДК прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя традыцыйнаму ўшанаванню жанчыны-маці. 14 кастрычніка ў Дом культуры на свята матуль былі запрошаны лепшыя прадстаўніцы раёна, якія вызначыліся перамогамі ў розных конкурсах.**

Асаблівай пашаны заслугоўваюць жанчыны, якія не толькі самі з'яўляюцца добрымі маці, але і вядуць актыўную выхаваўчую дзейнасць у грамадстве. Дабрыня і самахвярнасць, бескарыслівасць і высакароднасць – без спалучэння гэтых лепшых чалавечых якасцяў немагчыма закласці ў сваіх дзецях любоў да сям'і, роднага гнязда. На Шумілінщчыне ёсць шматдзетныя маці, якія вырасцілі шчаслівымі не толькі сваіх родных дзяцей, але і ўзялі на сябе клопаты па выхаванню дзяцей-сірот, якія засталіся без апекі бацькоў.

Па існуючай традыцыі, кожны год адну з лепшых жанчын-маці раёна адзначаюць прэміяй імя Героя Сацыялістычнай Працы С. Т. Пальвінскай. За выканаваную высакародную справу па выхаванні траіх сыноў сёлета была ўзнагароджана Наталля Сяргеева з Мішневіч. Старанныя працаўніцы, якія прадстаўляюць працоўныя калектывы раёна, не раз былі запрошаны на свята ў вобласць. Самыя паспяховыя з іх, якія сумяшчаюць мацярынскія і працоўныя абавязкі, у гэты дзень трапілі на прыём да старшыні аблвыканкама Аляксандра Касінца. Маці чацвярых дзяцей, аператару машыннага даення з аграгарадка Светласельскі Валянціне Багданавай, была ўручана прэмія імя Тусналобавай -Марчанка.

На долю жанчын выпадае нямала выпрабаванняў, ад якіх залежыць дабрабыт сям'і. Бо бездакорная праца накіравана на тое, каб дзеці мелі магчымасць развівацца ў камфортных умовах. Таму не выпадкова на сустрэчу былі запрошаны лепшыя гаспадары раёна, пераможцы раённага конкурсу "Мая зямля – мой родны дом". Усе гаспадары ўзорных падворкаў атрымалі чыста сімвалічныя падарункі: кветкі і дыпломы ад чыноўнікаў Шуміліскага райвыканкама. Цудоўны канцэрт для шаноўных гасцей падрыхтавалі работнікі культуры і самадзейныя артысты.

Хочацца верыць, што гэта міжнароднае свята – Дзень маці надалей не будзе зусім сапсавана афіцыёзам, як тое было падчас улады камуністаў. З заканчэннем эпохі "савецкага шчасця" дадаліся сюды яшчэ і іншыя святы – рэлігійныя, а таксама запазычаныя з іншых краінаў. Дарэчы, большасць краінаў – США, Аўстралія, Германія, Італія і інш. Дзень маці адзначаюць у пачатку траўня.

Беларусь бадай, што адзіная краіна, дзе святкаванне Дня маці прымеркавана да свята "Покрова Пресвятой Богородицы". На 14 кастрычніка яго прызначыў кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў 2006 годзе. Безумоўна, кіраўнікам на дзяржаўным узроўні карціць лішні раз падцвердзіць свае прыярытэты сацыяльнай палітыкі, прызнаць больш важную ролю жанчын у развіцці грамадства. Аднак чаму свята жанчыны маці прыпадае на Пакровы? Пакровы – сімвал таго, што святая Багародзіца бярэ пад свой покрыў усіх нас, захінаючы ад напасцяў і бедаў. Таксама нашы матулі засцерагаюць нас ад усякай небяспекі, просяць у Бога долі і літасці для нас. Атрымліваецца, што гэта свята спалучана з рэлігійнымі ўрачыстасцямі – ва ўсіх праваслаўных цэрквах праходзіць урачыстае богаслужэнне ў гонар Божай Маці.

**С. Горкі.**

ТЭРЫТОРЫЯ ДАБРА

## Дабрачынная акцыя мішневіцкіх валанцёраў

**Праект "Мы разам", які здзейснілі вучні Мішневіцкай школы разам з бацькамі быў разлічаны на дапамогу пажылым людзям. У Дзень пажылых людзей старшакласнікі перадалі цёплыя рэчы для састарэлых, якія знаходзяцца ў бальніцы сястрынскага нагляду.**

Прынамсі, самымі актыўнымі ўдзельнікамі ўсіх праграм і накірункаў таварыства Чырвонага Крыжа з'яўляюцца школьнікі нашага раёна. Прычым у большасці выпадкаў прымаюць удзел у тых праектах, якія маюць сацыяльную накіраванасць. Напярэдадні юныя валанцёры з Мішневіч правялі акцыю "Пакінь свой след". Каля бальніцы ў парку імі было пасаджана некалькі дзесяткаў дрэў. У бліжэйшым будучым удзельнікі праекта "Мы разам" плануюць заклаці каля бальніцы пладовы гадавальнік. Па добрай традыцыі валанцёры -старшакласнікі ў святочныя дні прыходзяць у бальніцу сястрынскага нагляду з падарункамі. А ветэранам, пажылым людзям і ўсім пацыентам бальніцы прыносяць паштоўкі і кветкі. Гэта тым больш важна, што наша моладзь не праходзіць міма болю адзінокіх пажылых людзей, якім выпала доля дажываць свой век у казённай установе.

**С. Горкі.**

## "СВІТАНАК" У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчаецца на партале *http://kamunikat.org/*, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: *http://kamunikat.org/svitanak.html*, што у каталагу "Пэрыёдыка" для далейшага выкарыстання яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.**

## АБ'ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бясплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя «Світанка» змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

## У ЦЭНТРЫ УВАГІ

# "Прэзыдэнцкія дамы" даюць трэшчыны

**Рабочая група з райвыканкама праводзіла сустрэчу з насельніцтвам, якое пражывае на тэрыторыі Дабейскага сельсавета. Як высветлілася, колькасць пытанняў да раённых службаў у мясцовага насельніцтва толькі ўзрастае. Найбольш злабадзённыя з іх датычацца няякаснага будаўніцтва жылых дамоў у аграгарадках, якасці рамонту шматпавярховак і іншых пытаннняў камунальнага парадку.**

Чарговы "дзень сельвыканкама пачаўся з агляду вёсак Дабейшчыны. Удзельнікі інфармацыйна-прапагандысцкай групы на чале са старшынёй Шумілінскага райсавета Ірынай Новікавай наведалі як цэнтральную сядзібу, так і аддаленыя вёскі. Яны сустракаліся з вяскоўцамі ў звычайных сялянскіх хатах, або ў нейкім іншым загадзя ўмоўленым месцы, працей кажучы, працавалі ў палявых умовах.

Перадусім у будынку сельсавета адбылося кароткае пасяджэнне, на якім кіраўнікі інфармацыйных груп акрэслілі найбольш важныя пытанні. Найперш паўсталі праблемы вулічнага асвятлення. На двары восень, цямнее рана, а ліхтары падключаны не ўсюды. Падключаюць ліхтары па адпаведнай схеме, аднак калі дойдзе чарга да аддаленых вёсак? Тым больш, што бракуе грошай на аплату за спажытае святло. На асвятленне ў раёне да канца года засталося 70 мільёнаў рублёў, на Дабейскі сельвыканкам выдзелена 7,5 мільёнаў.

Па сітуацыі з палівам давалі тлумачэнні галоўны ляснічы І. Трынογін і дырэктар "гартопу" Уладзімір Кійко. Чарга на дровы па-ранейшаму вялікая, цэны касмічныя, шлях дастаўкі няблізкі, а транспарту не хапае – два трактары на ўвесь раён. Дзе выйсце? Пакуль што вырашылі дамовіцца з няякасны гаспадаркай. Кіраўніцтва калгаса "Прыазёрны" можа дапамагчы з тэхнікай. А каб пенсіянерам не дабірацца ў раён за выпіскай, у вёскі Дабею і Амбросавічы будзе прыязджаць бухгалтар.

У ходзе сустрэчы найбольш наракання на раённыя службы з боку жыхароў было на дрэнны стан жылых дамоў і няякасны рамонт камунікацый. У аднай гаспадыні з аграгарадка Амбросавічы яшчэ вясной пачаліся праблемы з жыллём. Гэтак званы "прэзыдэнцкі дом" неўзабаве пасля будаўніцтва даў трэшчыну, праз якую зараз паступае халоднае паветра. Заяўку на рамонт падалі даўно, а будаўнікі не прыехалі ні летам, ні восенню. Жанчыне патлумачылі, што трэба лепш своечасова падаваць адразу пісьмовую заяву ў райвыканкам, а не званіць да будаўнікоў. Абяцалі дапамагчы.

Жыхары аднаго з дамоў вёскі Прыазёрная скардзіліся на якасць рамонту пад'езда, які камунальнікі зрабілі з недахопамі. Жыхары вёскі Дабея непакоіліся за дрэнны стан будынка, у якім знаходзіцца сельскі клуб і бібліятэка. Дах працякае – ад вільгаці псуецца памяшканне. Але тут усё залежыць ад грошай, а сума патрэбна значная. Пытанне ўзята на кантроль.

У вёсцы Непароты закрылі магазін – нявыгадна, мала пакупнікоў, да таго ж прадаўцы не хочуць працаваць за маленькую зарплату. Зараз да вяскоўцаў заходзіць аўталаўка, але іх на задавальняе бедны асартымент тавараў. Старшыня райсавета Ірына Новікава апраўдалася тым, што маўляў, не ўсё залежыць ад мясцовага кіраўніцтва, трэба ж яшчэ і ўлічаваць цяжкую сітуацыю на гандлёвым рынку краіны. Былі папарокі і ў адрас нарыхтоўшчыкаў: сёлета на прыватных агародах урадзіла бульба, а здаць няма куды – магазіны райспажыўтаварыства не прымаюць.

Як паказаў час, сустрэчы раённых прапагандыстаў пад кіраўніцтвам у раёне ўжо прыжыліся. Але ці многа карысці ад такіх метадаў работы з насельніцтвам? Шырокім колам грамадскасці невядома, якія там графікі аб'ездаў, хто, дзе і калі наведае тутэйшы люд. І сапраўды, вось на месца прыехала начальства, а людзі паскардзіліся на жыццё. Пытанні, як кажуць, ўзялі на кантроль і паехалі ў кабінеты. А засталіся засталіся сам насам са сваімі праблемамі. Ды і хто прыходзіць на тыя сустрэчы? Невялікая купка пенсіянераў, ў асноўным бабулькі сталага веку.

У некаторых раёнах Беларусі ўлады арганізуюць агульныя сходы грамадзян, дзе перад выбаршчыкамі трымаюць справаздачу дэпутаты, людзі выбіраюць старэйшын, выказваюць заўвагі і пажаданні ў адрас упраўленняў і аддзелаў. На Шумілінішчыне падобных мерапрыемстваў не праводзіцца. Выбаршчыкі нават не ведаюць сваіх дэпутатаў і старэйшын. Зрэшты, чаго яны павінны іх ведаць, калі самі не выбучалі ў кандыдаты – за іх усё вырашае начальства зверху. Вось і выходзіць, што празмерная апека выканаўчай улады над грамадзянамі звяла працу органаў самакіравання да фармалізму і паказухі.

**Алесь Шумскі.**

# ПРАБЛЕМЫ СЕЛЬСКІХ АМБУЛАТОРЫЙ

**"Другое дыханне" атрымалі сельскія амбулаторыі пасля таго, як сельскія населеныя пункты ператварыліся ў аграгарадок. Пасля рэканструкцыі будынка амбулаторыі ў Мішневічах і фельчарска-акушэрскага пункта ў Крывым Сяле тут адбыліся значныя зрухі ў лепшы бок. Аднак ці палепшыць касметычны рамонт аб'ектаў якасць медыцынскага абслугоўвання?**

Цяжка вызначыць штосьці галоўнае ў аграгарадках Шумілінішчыны, дзе ўсё ствараецца ўзаемазвязана: жыллё, вытворчы патэнцыял, інфраструктура, занятасць насельніцтва, сфера паслуг. Асновай, на якой трымаюцца аграгарадкі, з'ўляецца сельскагаспадарчая дзейнасць. Аднак галоўны капітал – гэта людзі. Таму ахове здароўя людзей павінна ўдзяляцца асаблівая ўвага. Безумоўна, для таго каб забяспечыць даступнасць і якасць аказання першаснай медыцынскай дапамогі, неабходна развіццё сеткі ўрачэбных амбулаторый. Аднак з усяго відаць, што нейкіх кардынальных зменаў не адбываецца. Як і некалькі апошніх гадоў, сёлета у раёне выканаваны бягучы капрамонт старых будынкаў. Пры гэтым ажыццяўлялася абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Найбольш пашанцавала сельскай амбулаторыі ў аграгарадку Мішневічы. Абноўлены фасад: двухпавярховы будынак абтынкованы і пафарбаваны. Унутры правялі рэканструкцыю: да трох былых кабінетаў дадаліся яшчэ і дзіцячы кабінет, акушэрскі, працэдурны, лабараторыя і кабінет дзённага стацыянара.

Рэканструяваны і будынак фельчарска-акушэрскага пункта ў Крывым Сяле. Заменены ўсе вокны і дзверы, адрамантаваны дах. Ва ўсе чатыры кабінеты: працэдурны, акушэрскі, для прыёму хворых і дзіцячы завезена новая мэбля.

На жаль, крызісныя з'явы ўнеслі не лепшыя карэктывы ў план рамонту і мадэрнізацыі сельскіх амбулаторый . Даводзіцца выбіраць паміж набыццём медыцынскага абсталявання і мэбляй. Паводле галоўнага ўрача Баканава, стаматалагічную ўстаноўку для крывасельскага ФАПа абяцалі закупіць у наступным годзе. Дагэтуль на завершаны рамонтныя работы на ФАПе у Дабеі. А для Ляжнёўскага ФАПа пакуль што набылі будаўнічыя матэрыялы.

Праўда, калі быць да канца шчырым, дык трэба прызнацца, што "сацыяльны стандарт" у сферы медыцынскага абслугоўвання прыгожымі будынкамі не забяспечыць. У амбулаторыях і ФАПах няма транспарту, і сельскім медыцынскім работнікам нязручна дабірацца да хворага за некалькі кіламетраў. Да таго ж надзвычай востра адчуваецца кадравая праблема.

У прыватнасці, на сённяшні дзень насельніцтва Шумілінскага раёна абслугоўвае 471 медыцынскі работнік, з якіх 44 урачы. Зараз не хапае 13 урачоў, а кожны другі працуючы – пенсіянер ( у пачатку года быў кожны чацвёрты). Як бачым, мінусавая дэмаграфія, старэнне насельніцтва раёна, рост смяротнасці (на 170 народжаных 291 памерлых, чвэрць з якіх працаздольныя ) – гэта ўжо не медыцынскія праблемы, а сацыяльныя. Пенсіянеры лечаць пенсіянераў, а маладыя ўрачы шукаюць лепшай долі ў іншым месцы. Затое фасады амбулаторый прыгажэюць.

**Аляксандр Шчамлёў.**

## КРЫМІНАЛ

### Абрабавалі агарод

16 кастрычніка ў Шумілінскі РАУС звярнуўся непрацуючы 1962 года нараджэння, жыхар вёскі Мікалаёва. Ён паведаміў, што невядомыя злодзеі калля вёскі ў агародзе зрэзалі 33 качаны капусты. Матэрыяльны ўрон саставіў 100 тысяч рублёў. Як высветлілася ў ходзе вышуку, капусту скралі рабочы 1966 года нараджэння і яго жонка – непрацуючая 1971 года года нараджэння, абое пражываючыя ў суседняй вёсцы Гусінцы. Узбуджана крымінальная справа па артыкуле 205 частка 2 КК.

### Скраўмабільнік

У міліцыю звярнулася пенсіянерка 1956 года нараджэння з заявай аб тым, што ў яе прапаў мабільнік "Нокія" коштам у 100 тысяч рублёў. У ходзе следства пад падазрэннем апынуўся малады чалавек 1989 года нараджэння. Тэлефон вернуты гаспадыні. Заведзена крымінальная справа па артыкуле 205 частка 2 КК.

## ТЭРЫТОРЫЯ ДАБРА

# АМЕРЫКАНСКІЯ СПОНСАРЫ НАВЕДАЛІ ШУМІЛІНА

**Амерыканская сямейная пара Кіт і Прысцыла Хаф са Штата Юта, якая прадстаўляе ў Беларусі Міжнароднае дабрачыннае грамадскае аб'яднанне "Сафія", ужо ў другі раз завітала ў Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Падчас першага візіту прадстаўнікі аб'яднання аказалі гуманітарную дапамогу аддзяленню дзённага прабывання і рэабілітацыі інвалідаў.**

У межах праекта, агульны кошт якога склаў дзевяць мільёнаў рублёў, было набыта абсталяванне для кухні і мяккая мэбля. Зараз амерыканскія валанцёры мелі магчымасць убачыць, на якія мэты пайшлі ахвяраванні гуманітарнай службы царквы Ісуса Хрыста Святых апошніх дзён.

Замежныя госці пазнаёміліся з дзецьмі, якія займаліся ў гуртках, створаных пры аддзяленні дзённага прабывання і рэабілітацыі інвалідаў. Гуманітары засталіся задаволеныя вынікамі сваёй місіі. Дзеці ў аддзяленні не толькі праходзяць курс рэабілітацыі, але і робяць розныя сувеніры, вучацца гатаваць прысмакі. Дарэчы, для падагравання ежы на грошы спонсараў купілі мікрахвалевую печ.

Праграмы грамадскага аб'яднання "Сафія" ажыццяўляюцца за кошт наведвальнікаў царквы. Такія праекты па аказанні дапамогі ўжо былі праведзеныя ў Літве, Эстоніі, Латвіі, Расіі, Балгарыі, Турцыі. Ва Ўсходняй Еўропе гуманітарнай дзейнасцю займаюцца 22 сямейныя пары. Калі яны едуць у якую-небудзь краіну, то жывуць толькі за свой кошт.

Расказалі госці шумілінцам і пра сваіх дзяцей. Дома ў Амерыцы ў Кіта і Прысцылы 7 дзяцей і 24 унукі. Дзеці ўжо дарослыя і жывуць самастойным жыццём. А пажылая пара, выканаўшы сямейныя абавязкі, вырашыла прысвяціць сваё жыццё хрысціянскім каштоўнасцям. Дабрачыннай дзейнасцю на Беларусі займаюцца амаль два гады. Так, несумненна, за гэты час у іх была добрая магчымасць паглядзець, як жывуць людзі ў Беларусі, чым захапляюцца дзеці і ў якіх умовах працуюць іх бацькі.

**Я. Вайтовіч.**

# ІХ МЭТА – ДАПАМАГАЦЬ БЛІЖНІМ

**Актывісты валацёрскага руху Шумілінішчыны пабывалі на абласным форуме. Валанцёры з вёскі Мікалаёва прадставілі на форуме ў Віцебску інфармацыю аб праекце "Міласэрднасць".**

Хто такія валанцёры з Мікалаёва, зараз ў раёне ведаюць многія, і пра іх дзейнасць у рамках міні-праекта "Міласэрднасць чулі неадночы. Іх дэвіз –дабрачыннасць, іх мэта – дапамагаць бліжнім, іх стымул – бескарыслівасць. Кожны сельскі валанцёр (усяго дзесяць актывістаў) абслугоўвае па дзве сям'і састарэлых людзей. Іх там чакаюць, і яны заўсёды прыедуць на дапамогу.

Канешне, валанцёрскі рух у нашым невялікім рэгіёне не так распаўсюджаны, як у буйных гарадах, але галоўнае, што ён ёсць, прыносіць вынікі і мае перспектывы развіцця. Таму на форуме ў Віцебску дзейнасць сельскіх валанцёраў з Мікалаёва выклікала ў прысутных вялікую цікавасць. Разам з валанцёрамі на форуме былі і самадзейныя артысты з Мікалаёўскага сельскага клуба, якія далі невялікі канцэрт.

**Алесь Прыбярэжны.**

## КУЛЬТУРНАЯ ПАДЗЕЯ

# ВЫСТАВА НА ВАКЗАЛЕ

**У зале чакання чыгуначнага вакзала мястэчка Шуміліна адкрылася новая выстава. Яна прымеркавана да 145 –годдзя старэйшага будынка райцэнтра.**

Як вядома, наш раённы цэнтр адносна малады, стаў мястэчкам напрыканцы 19 стагоддзя, таму ў ім няма гістарычна-архітэктурных помнікаў. І толькі комплекс станцыйных збудаванняў: вакзал, склад, воданапорная вежа – з'яўляюцца помнікам прамысловай архітэктуры.

Работнікі Шумілінскага краязнаўчага музея падрыхтавалі новы праект для таго, каб азнаёміць жыхароў і гасцей нашага раёна з гісторыяй станцыі і жыццём чыгуначнікаў. У экспазіцыі паказаны копіі дакументаў і старых фотаздымкаў, якія захаваліся з часоў будаўніцтва Рыга-Арлоўскай чыгункі.

Да 1886 года Шуміліна было невялікім сялом. Але пасля адкрыцця руху на ўчастку Полацк-Віцебск прыцягласцю ў 242 вярсты населены пункт набыў асаблівае значэнне. Будаўніцтва чыгуначнай станцыі Сіроціна ( па той час гэта было самае буйное мястэчка) паскорыла развіццё нашага рэгіёна, які з цягам часу ператварыўся ў Шумілінскі раён. А Шуміліна з населенага пункта (у 1886 годзе тут пражывала 38 жыхароў) вырасла да адміністратыўнага цэнтра, насельніцтва якога складае 7351 чалавек.

Усе жадаючыя маюць магчымасць пазнаёміцца з матэрыяламі аб нашых земляках, якія працавалі на чыгунцы. Апроч таго, на выставе прадстаўлены фотаздымкі чыгуначнай тэхнікі мінулых гадоў.

**Алесь Прыбярэжны.**

НАША ЎЛАДА

# НЯКЛЯЕЎ ПРА ЛУКАШЭНКУ

КІРАЎНІК БЕЛАРУСІ АЛЯКСАНДАР ЛУКАШЭНКА СУСТРЭЎСЯ ЗЬ СЯБРАМІ САЮЗУ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ БЕЛАРУСІ, ЯКІ ЎЗНАЧАЛЬВАЕ МІКАЛАЙ ЧАРГІНЕЦ. ЯК АЦЭНЬВАЮЦЬ ТЭМЫ І ВЫНІКІ СУСТРЭЧЫ ПРАДСТАЎНІКІ НЕЗАЛЕЖНАГА САЮЗУ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ?

Падчас сустрэчы Аляксандар Лукашэнка заклікаў сяброў праўладнага пісьменьніцкага саюзу «сьмела падымаць у сваіх кнігах сацыяльныя, сьветапоглядныя і маральныя праблемы сучаснасьці. Але не апускацца да вульгарнасьці, ачарненьня і пошласьці». І патлумачыў, што СПБ і быў створаны таму, што «Аддаваць культуру на ганьбаваньне адшчапенцам было нельга». Што «Саюз беларускіх пісьменьнікаў», у які ўваходзяць такія вядомыя беларускія паэты і празаікі, як Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Уладзімер Арлоў і многія іншыя, — гэты саюз «заграз у нацыяналізьме і палітычных інтрыгах», а самі так званыя «сьвядомыя пісьменьнікі» «разьмянялі талент на замежныя гранты, у сваіх опусах паліваюць брудам нашу краіну, абражаюць уласны народ і падбухторваюць моладзь да бессэнсоўных бунтаў».

Тэмы і зьмест размовы кіраўніка краіны і праўладнага пісьменьніцкага саюзу камэнтуе палітык і паэт, сябра Саюзу беларускіх пісьменьнікаў Уладзімер Някляеў: «Той, хто лічыць сябе прэзыдэнтам, сустрэўся з тымі, хто лічыць сябе пісьменьнікамі. Насамрэч ні ў першым, ні ў другім выпадку гэта не адпавядае рэчаіснасьці. І рэальныя праблемы на гэткай сустрэчы абмяркоўвацца не маглі. Рэальная праблема — гэта, найперш, стан беларускай мовы і наўпрост з гэтым зьвязаная праблема — самой літаратуры.

Я напісаў кшталту ліста да вось гэтага праўладнага Саюзу пісьменьнікаў Беларусі, які забраў гістарычную назву найстарэйшай пісьменьніцкай арганізацыі, каб яны ўзважылі тое, што насамрэч адбываецца ў краіне. Яны дэкляруюць нейкія рэчы патрыятычнага кшталту, грамадзянскага палу, а насамрэч ёсьць тое, што ёсьць — катастрафічны стан беларускай мовы. І пры ўсім тым, што яны дэкляруюць, іх не чытаюць не таму, што яны мала друкуюць кніг, а таму, што іх няма каму чытаць. Што сёньня нельга набраць нават адной беларускамоўнай першай клясы, як тое было ў Горадні. Вось дзе праблема.

З гэтай праблемы і пачалася гаворка ў тыя „ліхія 90-я“, пра якія згадвае Лукашэнка, і чаму мы не паразумеліся. Ён тады запрашаў Раду Саюзу беларускіх пісьменьнікаў, каб мы пайшлі да яго ў ідэалягічную абслугу, каб мы абслугоўвалі ідэалягічны праект „адзіная дзяржава Беларусь-Расея“. Гэтага не магло быць, і праз гэта ўзьнік канфлікт, праз гэта Лукашэнка і стварыў „правільны“ пісьменьніцкі саюз. Саюз, які ў сёньняшняй сытуацыі — катастрафічнай для беларускай нацыі — прымае дакумэнт, што ўхваляе „мудрую“ палітыку гэтага чалавека, які называе сябе беларускім прэзыдэнтам. І які адначасна заяўляе, што на беларускай мове нельга напісаць нешта значнае, вартае і вялікае. Дык пра што можна размаўляць з такім чалавекам? Вось там ніякай гаворкі і не было».

**Галіна Абакунчык.**

ВАЛЮТНЫ КРЫЗІС

# КРЭДЫТУ БЕЛАРУСЬ ПАКУЛЬ НЕ АТРЫМАЕ

МІСІЯ МІЖНАРОДНАГА ВАЛЮТНАГА ФОНДУ, ЯКІЯ СКОНЧЫЛІ ПРАЦУ Ў БЕЛАРУСІ, ПРАДСТАВІЛА СВАЕ ВЫСНОВЫ АБ БЯГУЧАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ СІТУАЦЫІ Ў КРАІНЕ.

Беларускія ўлады павінны пацвердзіць і прадэманстраваць прыхільнасць эканамічным рэформам для атрымання крэдыту Міжнароднага валютнага фонду, акрамя таго, ім неабходна звярнуць увагу на высокую інфляцыю, заявіў кіраўнік місіі МВФ у Беларусі Крыс Джарвіс на прэс-канферэнцыі ў Мінску.

«Перш чым можна будзе прыступіць да перамоваў аб новай праграме, спатрэбіцца пацвердзіць намер рэформаў, а таксама пацвердзіць гэтыя намеры сваімі дзеяннямі», - сказаў Джарвіс. Ён удакладніў, што ў ходзе работы місіі пытанне крэдытавання Беларусі абмяркоўвалася з кіраўніцтвам рэспублікі. Па яго словах, МВФ настойліва рэкамендуе Беларусі панізіць інфляцыю. «Прысутнічае настойлівая неабходнасць панізіць інфляцыю, якая зніжае жыццёвы ўзровень і вядзе да росту інфляцыйных чаканняў», - сказаў Джарвіс.

Як заявіў на мінулым тыдні прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з Джарвісам, урад спадзяецца атрымаць ад Міжнароднага валютнага фонду крэдыт у памеры ад 3 да 7 мільярдаў даляраў.

Па дадзеных прэс-службы, эксперты МВФ станоўча ацанілі крокі ўрада і Нацбанка Беларусі па выхаду на адзіны раўнаважны курс беларускага рубля.

Існуючая дэвальвацыя дазволіла скараціць дэфіцыт рахунку бягучых аперацый, аднак дадзенае дасягненне можа быць згублена пад уздзеяннем высокай інфляцыі, калі яна захаваецца. Для дасягнення знешняй устойлівасці і ўнутранай стабільнасці важна, каб урад і Нацбанк Беларусі распачалі ў цяперашні час дзеяння па скарачэнні інфляцыі.

Як адзначыў Крыс Джарвіс, палітыка ўладаў па стрымліванні крызісу арыентавана ў правільным кірунку. Пасля адкрыцця другой сесіі на валютным рынку ў верасні был палегчаны доступ да замежнай валюце.

«Аднак неабходна неадкладна рэалізаваць шэраг сур'ёзных дадатковых крокаў, - заявіў Джарвіс. - Мы рэкамендуем ураду да канца 2012 года працягваць прымаць усе магчымыя меры для стрымлівання расходаў і» замарожвання «крэдытавання ў рамках дзяржпраграм, якое прывяло да празмернага росту крэдыту і інфляцыі. Нацыянальнаму банку варта далей і хутчэй павышаць працэнтныя стаўкі да узроўня, якія перавышаюць далейшы ўзровень інфляцыі, каб насельніцтва было ўпэўнена ў тым, што іх зберажэнні прынясуць станоўчыя даходы. Стрымліванне росту зарплаты таксама мае крытычнае значэнне. У цяперашні час шырока прызнаецца, што павышэнне заработнай платы ў лістападзе 2010 спрыяла ўзнікненню крызісу ў сакавіку 2011 года. У сувязі з гэтым мы рэкамендуем ўстрымацца ад далейшага павышэння тарыфнай стаўкі першага разраду работнікаў бюджэтнай сферы і дзяржпрадпрыемстваў «.

Пры гэтым Крыс Джарвіс падкрэсліў, што Беларусі для актыўнага і доўгатэрміновага эканамічнага росту патрэбныя глыбокія структурныя рэформы.

Гаворачы аб магчымым прадастаўленні Беларусі крэдыту МВФ, Крыс Джарвіс паведаміў, што ў ходзе работы цяперашняй місіі сума крэдыту не абмяркоўвалася. Агучаныя раней сумы (ад 3 да 7 мільярдаў даляраў) - гэта ацэнка беларускіх патрэбаў урадам краіны. Вызначэнне ж канкрэтнай сумы новай праграмы крэдытнага супрацоўніцтва МВФ і Беларусі можа адбыцца «ў рамках наступнай місіі, калі яна адбудзецца», заявіў Крыс Джарвіс. Зараз жа МВФ, па словах Джарвіса, чакае ад беларускага ўрада і Нацбанка канкрэтных дзеянняў, накіраваных на ўзмацненне жорсткасці эканамічнай палітыкі ў Беларусі ў 2011 годзе, а таксама планаў эканамічнага развіцця ў 2012 годзе, якія будуць падтрыманы прэзідэнтам.

**Сяргей Лунін.**

СВЕТ ПРА БЕЛАРУСЬ

# ДЭФОЛТ БЕЛАРУСІ НЕПАЗБЕЖНЫ

ЛУКАШЭНКА ПЕРАЖЫВАЕ СВОЙ САМЫ СУР'ЁЗНЫ КРЫЗІС ЗА 17 ГАДОЎ ЗНАХОДЖАННЯ ВА ЎЛАДЗЕ.

АБ ГЭТЫМ ПІША СТАРШЫ НАВУКОВЫ СУПРАЦОЎНІК ІНСТЫТУТА СУСВЕТНАЙ ЭКАНОМІКІ АНДЭРС АСЛУНД.

Беларусь рухаецца ў кірунку дэфолту. Міжнародныя валютныя рэзервы гэтай краіны з насельніцтвам у 10 мільёнаў чалавек на зыходзе. Паводле афіцыйнай інфармацыі на 1 кастрычніка яны склалі $ 2,2 млрд., суме роўнай аб'ёму імпарту за адзін месяц. Але калі запасы настолькі малыя, заўсёды ўзнікае пытанне, ці магчыма іх сапраўды выкарыстаць. Аляксандр Лукашэнка перажывае свой самы сур'ёзны крызіс за 17 гадоў знаходжання ва ўладзе. І гэты крызіс можа стаць апошнім. Памылкі ў эканамічнай палітыцы зроблены ім мінулай восенню і выклікалі гэты небяспечны фінансавы крызіс.

Беларусь з'яўляецца апошняй савецкай эканомікай у Еўропе. Дзяржаўныя прадпрыемствы па-ранейшаму вырабляюць 70 працэнтаў валавога ўнутранага прадукту, а дзяржава рэгулюе вытворчасць і асноўнае цэнаўтварэнне. Будзе толькі невялікім перабольшаннем сказаць, што Беларусь жыве за кошт перапрацоўкі субсідыруюцца Расеяй нафты і газу на Захад, экспартуючы лепшыя савецкія ўзоры вытворчасці ў правінцыі Расіі. Гэтая мадэль працавала на здзіўленне доўга, але Крэмль не мае асаблівай любові да Лукашэнкі, і асноўнай прычынай крызісу з'яўляецца тое, што Расея ў гэтым годзе скараціла свае энергетычных субсідыі з 15 працэнтаў ВУП Беларусі да 7 адсоткаў. У той час як у жыхары расійскай правінцыі запыты сталі занадта высокімі для таго, каб набываць якую б то ні было савецкую прадукцыю.

Вырашальнай памылкай Лукашэнкі стала рашэнне падняць заработную плату ў дзяржаўным сектары на 50 працэнтаў у лістападзе мінулага года, да прызначаных на 19 снежня прэзідэнцкіх выбараў. Як следства, у мінулым годзе сярэдняя рэальная заработная плата ў краіне вырасла на 25 адсоткаў, і дасягнула $ 500 у месяц, сумы, якую кіраўнік паабяцаў падтрымліваць праз завышаны абменны курс у адносінах да даляра ЗША. Завышаны курс беларускага рубля выклікаў зияющий дэфіцыт бягучага рахунку роўны 15,5 адсотка ВУП, або $ 8,5 млрд. у 2010 годзе.

Нягледзячы на гэта, вынікі прэзідэнцкіх выбараў для Лукашэнкі былі настолькі дрэннымі, што афіцыйныя справаздачы назіральнікаў наводзяць на думку, што ён іх скраў, выкарыстоўваючы гвалт і прысудзіўшы большасць сваіх канкурэнтаў да шматгадовых турэмных тэрмінаў. Злучаныя Штаты і Еўрапейскі Саюз адказалі ва ўнісон санкцыямі супраць некаторых службовых асоб і прадпрыемстваў і запатрабавалі неадкладнага вызвалення 40 палітычных зняволеных, але многія да гэтага часу знаходзяцца ў турме.

Замест таго, каб правесці неабходныя рэформы, калі ў яго яшчэ быў час, Лукашэнка паспрабаваў сабраць грошай там, дзе ён можа. Міжнародныя валютныя рэзервы ў гэтым годзе вагаліся паміж $ 3 млрд і $ 4 млрд, у той час як краіна мае патрэбу больш чым 6 мільярдах даляраў толькі ў гэтым годзе. Нягледзячы на некаторыя расплывістыя заявы ад Еўрапейскага саюза і МВФ, аб заходнім фінансаванні не можа быць і гаворкі. Тое ж самае адносіцца і да рынку. Да вясны 2011 года фінансавы крызіс у Беларусь выйшаў з-пад кантролю, узмацніўшы пратэстныя настроі.

Адна з праблем Лукашэнка складаецца ў тым, што ў яго няма сяброў. Варта прызнаць, што Кітай падаў крэдыт у $ 1 млрд юаняў, а Іран - у 400 мільёнаў даляраў, але гэтага недастаткова. Хоць Крэмль моцна не любіць Лукашэнку, ён зацікаўлены ў палітычнай стабільнасці на сваіх задворках. Расея патрабуе правядзення прыкладна такіх жа рэформаў як і МВФ: плаванне абменнага курсу, лібералізацыі цэн, больш жорсткай грашова-крэдытнай палітыкі і, асабліва, істотнай прыватызацыі, якая пойдзе на карысць перш за ўсё расійскім прадпрыемствам. У Лукашэнкі няма іншага выйсця, акрамя як прыняць умовы расійскага боку. Урад Расеі неахвотна вылучае па 1 млрд. у год на працягу трох гадоў з Еўразійскай антыкрызіснага фонду, які ў асноўным, фінансуецца Расеяй, у абмен на дэвальвацыю і прыватызацыю прадпрыемстваў на агульную суму $ 7,5 млрд. на працягу трох гадоў. Але гэтых сум дастаткова каб пакрыць толькі палову патрэбнасці Беларусі ў фінансаванні.

Таму 24 мая Беларусь дэвальвавала валюту на 56 адсоткаў, але Лукашэнка не дазволіў валюце плаваць. У выніку краіна апынулася ў горшым з усіх магчымых сітуацый, як і Савецкі Саюз у 1991 годзе, калі ў дэфіцыце можа апынуцца любы тавар. Беларусы абнаявілі свае зберажэнні, каб купіць любыя даступныя тавары ці валюту. Свабодныя цэны растуць уверх, у той час як у дэфіцыце апыняюцца тавары з рэгуляванымі коштамі, якія беларусы купляюць і вывозяць на продаж у суседнія краіны.

Лукашэнка выказаў надзею, што МВФ зноў возьме яго на парукі. У студзені 2009 года, МВФ ужо паспрабаваў дапамагчы, заключыўшы пагадненне аб выдзяленні крэдыту ў $ 3,6 млрд., які скончыўся ў сакавіку 2010 года, але Беларусь так і не правяла абяцаных рынкавых рэформаў. Зараз прэзідэнт папрасіў у МВФ ужо не $ 3,5, а $ 8 млрд, але місія МВФ адмовіла з нечакана жорсткай фармулёўкай, што перш чым весці якія-небудзь перамовы аб фінансаванні «улады павінны будуць прадэманстраваць выразныя абавязацельствы, у тым ліку і на самым высокім узроўні, у пытанні стабілізацыі эканомікі і правядзення рэформы, і адлюструе гэтыя абавязацельствы ў сваіх канкрэтных дзеяннях». Але МВФ павінен быў адмовіць і з-за заходніх санкцый, і з-за кепскага паслужнога спісу Лукашэнкі.

Апошняй надзеяй на выжыванне ў Лукашэнкі застаецца продаж «фамільнага срэбра», некалькіх каштоўных буйных дзяржаўных карпарацый: калійнай кампаніі Беларуськалій, кампаніі Белтрансгаз, мабільнай тэлефоннай кампаніі МТС Беларусь, МАЗа, і Мазырскага НПЗ. Расія і кітайскія кампаніі былі гатовыя набыць іх, але гэтыя здзелкі стануць не больш чым распродажам пасля пажару, калі кампаніі сыдуць за бясцэнак і толькі падоўжаць пакуты беларусаў. У разгар нястрымнага фінансавага крызісу ўсё здзелкі па куплі буйных прадпрыемстваў як правіла прытармажваюць або зусім спыняюцца. Больш таго, Злучаныя Штаты і Еўрапейскі Саюз ужо ўвялі санкцыі супраць некаторых кампаній, і Злучаныя Штаты могуць лёгка блакаваць гэтыя продажы праз эмбарга, што і запатрабавалі шэсць відных амерыканскіх сенатараў.

Да сённяшняга дня Лукашэнка быў вядомы як непрадказальны, але вельмі падкаваны ў палітыцы тактык, але яго эканамічная безгаспадарчасць у рэшце рэшт давяла гэту эканоміку савецкага толку да жаласнага стану. У цяперашні час, дэфолт Беларусі з'яўляецца непазбежным, і можа быць справакаваны любым наступным значным пагашэннем запазычанасці.

**Пераклад з ангельскай - сайт charter97.org**

## БАРАЦЬБА ПРАЦОЎНЫХ

# БАРЫСАЎСКІЯ СТРАЙКОЎЦЫ ДАМАГЛІСЯ ПАДВЫШЭНЬНЯ ЗАРОБКУ

РАБОЧЫЯ-КАМУНАЛЬНІКІ БАРЫСАВА ПРАВЯЛІ ДВУХДЗЁННЫ СТРАЙК. ЯНЫ АДМОВІЛІСЯ ВЫВОЗІЦЬ СЬМЕЦЬЦЕ СА 100-ТЫСЯЧНАГА ГОРАДУ, ПАТРАБУЮЧЫ ПАДВЫШЭНЬНЯ ЗАРОБКАЎ. СЁНЬНЯ АДМІНІСТРАЦЫЯ БАРЫСАЎСКАГА ЎНІТАРНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА «ЖЫЛЬЛЁ» І ГАРАДЗКІЯ ЎЛАДЫ ПАЙШЛІ НАСУСТРАЧ ІХ ПАТРАБАВАНЬНЯМ.

Каля тысячы працаўнікоў Барысаўскага УП «Жыльлё» ў панядзелак і аўторак адмовіліся ад працы. У горадзе пачало зьбірацца нявывезенае сьмецьце. Страйк рабочых спэцаўтагаспадаркі падтрымалі працаўнікі Зелянбуду і Гарсьвятла. Патрабаваньні працоўнага калектыву да адміністрацыі: узьняць заробак на 30 адсоткаў, штомесячна індэксаваць заработную плату.

Як сьведчылі страйкоўцы, заробак у іх не падвышаўся каля году, нягледзячы на высокую інфляцыю. Цяпер вадзіцелі сьмецьцявозаў атрымліваюць крыху больш за мільён рублёў.

«Мы зусім мала атрымліваем. Па 600 тысяч, задушылі нас зусім. Такі заробак у тых, хто мётламі падмятае… А калі што, дык пагроза: звольню, звольню».

Рабочыя заяўляюць, што заробак трэба падвышаць нават не на 30 працэнтаў, а разы ў тры:

«У мяне мільён 200 тысяч, а калі бяз працы ў выходныя, то будзе 700 тысяч. А крэдыт у каго ёсьць, зараз жа даляр падняўся, працэнты трэба выплачваць. 3–4 мільёны трэба, каб плацілі…»

«Лукашэнка сказаў, што заробак будзе 500 даляраў, а пазьней будуць людзі па 700 атрымліваць. А цяпер ніхто не атрымлівае ні 700, ні 500».

У панядзелак і аўторак адміністрацыя прадпрыемства спрабавала пераканаць рабочых вярнуцца да працы. Галоўным яе аргумэнтам быў загад аб падвышэньні заробку на 20 працэнтаў, падпісаны заднім чыслом. Пры гэтым пратэст рабочых адміністрацыя не хоча прызнаваць страйкам, прафсаюз гэтую акцыю не падтрымаў. Гаворыць прадстаўнік адміністрацыі Мікалай Кацуба: «Гэта ня страйк, у працоўнай абстаноўцы вырашалася пытаньне ўзьняцьця заробку. Вось і ўсё. Я, шчыра кажучы, проста стаміўся. Я сам атрымліваю 1 мільён 447 тысяч. А людзі атрымліваюць ад 900 тысяч да мільёна трыста. За што ўзьняць, у нас пакуль няма».

Рабочыя паверылі ўладам і прыступілі да працы. Гаворыць адзін з вадзіцеляў Казімір Зіноўевіч: «Сёньняшнім пакуль часткова задаволеныя, пакуль паабяцалі, што ўсё, відаць, будзе добра. А як будзе далей — ня ведаю. Зарабляю я 1 мільён 200 тысяч, абяцалі дабавіць 20 працэнтаў. У нас да лістапада мінулага году заробак не падвышаўся. Ніякай індэксацыі не было. Наадварот, заробак паніжаецца».

Апазыцыйны актывіст з Барысава Міхаіл Васільеў быў сьведкам страйку і перамоваў рабочых з адміністрацыяй і гарадзкімі ўладамі:

«Людзі самаарганізаваліся і вырашылі дамагацца выкананьня сваіх правоў. Не было ў іх ніякіх яўных завадатараў. Маса людзей незадаволеная, з гэтым цяжка змагацца. Вось яна і пераліваецца цераз край — незадаволенасьць людзей. Канечне, гэта толькі пачатак — народ падыходзіць да жабраацтва».

На размову з рабочымі прыйшлі чыноўнікі з гарвыканкаму і міліцыя. Апошняя затрымала барысаўскага журналіста Аляксандра Зянькова, які здымаў падзеі на відэа, у пастарунку яму сьцерлі частку запісу. Прычыны затрыманьня тлумачыць сам Аляксандар:

«Улады ня хочуць, каб іншыя пабачылі, што тут адбыўся страйк і людзям падвысілі заробкі, бо страйкі пойдуць па ўсёй краіне. Яны гэтага баяцца».

**Валер Каліноўскі.**

## НАША САЛІДАРНАСЦЬ



# “РЭЖЫМ ЗАБАРАНЯЕ ПАЛІТВЯЗЬНЯМ ЭЛЕМЭНТАРНЫЯ РЭЧЫ”

НЯМЕЦКА-ШВАЙЦАРСКАЯ НЯЎРАДАВАЯ ПРАВААБАРОНЧАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ LIBERECO — PARTNERSHIP FOR HUMAN RIGHTS ЗЬ ВЯЛІКАЙ ЗАКЛАПОЧАНАСЬЦЮ СОЧЫЦЬ ЗА ЛЁСАМ БЕЛАРУСКІХ ПАЛІТВЯЗЬНЯЎ АНДРЭЯ САНЬНІКАВА, МІКОЛЫ СТАТКЕВІЧА, ЗЬМІТРА БАНДАРЭНКІ, ЗЬМІТРА ДАШКЕВІЧА, ЭДУАРДА ЛОБАВА, ПАЎЛА СЕВЯРЫНЦА.

Як адзначаецца ў заяве арганізацыі, у дачыненьні да Андрэя Саньнікава і Зьмітра Дашкевіча ў вязьніцах ужываюцца карныя захады, псыхалягічны ціск ды пагрозы гвалту. У гэтай сувязі Libereco заклікае беларускія ўлады тэрмінова гарантаваць фізычную бясьпеку і псыхічнае здароўе гэтым ды ўсім іншым зьняволеным.

Праваабаронцы таксама зьвяртаюць увагу на лёс прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча, які ў траўні 2010 году быў асуджаны на пяць гадоў з палітычных прычынаў, а таксама на лёс кіраўніка цэнтру «Вясна» Алеся Бяляцкага, якому пагражае сем гадоў турмы, сытуацыю вакол трох палітвязьняў — Ігара Аліневіча, Мікалая Дзядка, Аляксандра Францкевіча.

Да заклiку Libereco неадкладна вызваліць беларускіх палітзьняволеных далучыліся таксама вядомыя нямецкія і швайцарскія парлямэнтары: Філіп Місфэльдэр, Жан-Франсуа Штаерт, Бэрбель Кофлер, Франц Цёнэс, Ангеліка Граф. Раней гэтыя палітыкі падтрымалі ініцыяваную праваабаронцамі кампанію «Шэфства над палітвязьнямі», мэта якой — забясьпечыць кожнаму палітвязьню ў Беларусі і яго сям'і маральную ды матэрыяльную падтрымку з боку эўрапейскіх палітыкаў.

У прыватнасьці, дэпутат Бундэстагу і апякун Зьмітра Дашкевіча Філіп Місфэльдэр, спасылаючыся на дакладныя крыніцы, заявіў, што «сытуацыя, у якой апынуўся яго «падшэфны», — жахлівая».

Паводле словаў нямецкага палітыка, палітвязьню забараняюць элемэнтарныя рэчы, якія абавязковыя для больш-менш нармальнага ўтрыманьня ў турме. Гэта шпацыр на сьвежым паветры, перапіска, чытаньне прэсы, атрыманьне харчоў.

«Такі рэжым супярэчыць агульнапрынятым прынцыпам цывілізаваных нацый. Ён накіраваны на тое, каб толькі зламаць людзей і ў канчатковым рахунку зьнішчыць фізычна і духоўна», заявіў Місфэльдэр. Палітык запатрабаваў ад беларускіх уладаў неадкладна вызваліць ягонага падапечнага і паведаміць, якім чынам ён змог бы скантактавацца з Дашкевічам.

**Радыё Свабода.**

## НАША САЛІДАРНАСЦЬ

# ПРАЯВІ САЛІДАРНАСЦЬ! НАПІШЫ ЛІСТ ПАДТРЫМКІ ПАЛІТЫЧНЫМ ВЯЗНЯМ



*Лідэр “Маладога Фронту” Зміцер Дашкевіч*

**Алесь Бяляцкі**
знаходзіцца пад следствам:
220030, г.Мінск, вул. Валадарскага, 2 СІЗА-1
**Крымінальная справа аб масавых беспарадках**
АСУДЖАНЫЯ ЗА ПАДЗЕІ 19 СЬНЕЖНЯ
Адбываюць пакаранне:
**Андрэй Саннікаў**
213800, Магілёўская вобл., г. Бабруйск, вул. Сікорскага, 1
**Зміцер Бандарэнка**
213105 г.Магілёў, Слаўгарадская шаша, п /а Вейна
папраўчая калонія № 15
**Эдуард Лобаў**
225295 Брэсцкая вобл., г. Івацэвічы, «Воўчыя норы», а / с 20
папраўчая калонія № 22
**Мікола Статкевіч**
213004 Магілёўская вобл., г. Шклоў
выпраўленчая калонія № 17
**Зміцер Дашкевіч**
211791, Віцебская вобл., г.Глыбокае, вул. Савецкая, 205
папраўчая калонія № 13
**Павал Севярынец**
225143, Брэсцкая вобл., Пружанскі р-н, в. Куплін, ПУАТ-7
АСУДЖАНЫЯ ПА «СПРАВЕ АНАРХІСТАЎ»
**Мікалай Дзядок**
213105 г. Магілёў, Слаўгарадская шаша, п/а Вейна
папраўчая калонія № 15
**Аляксандр Францкевіч**
225295 Брэсцкая вобл., г. Івацэвічы, «Воўчыя норы», а / я 20
папраўчая калонія № 22
**Ігар Аліневіч**
211440 Віцебская вобл., г. Наваполацк, вул. Тэхнічная, 8
папраўчая калонія № 10
АСУДЖАНЫЯ ЗА НАПАД НА БАБРУЙСКАЕ КДБ:
**Яўген Васьковіч**
213105 г. Магілёў, Слаўгарадская шаша, п/а Вейна
папраўчая калонія № 15
**Пракапенка Арцём**
213004, Магілёўская вобл., г.Шклоў, ПК-17, атрад №15
**Сырамолатаў Павал**
213030, г. Магілёў, Слаўгарадзкая шаша, 3 км, ПК №19
ТАКСАМА
**Аўтуховіч Мікалай**
225293, Брэсцкая вобласць, г. Івацэвічы-3, ПК-5, атрад 13

## ВЕРШАВАНЫ ФЕЛЬЕТОН



**Сусветны эканамічны форум апублікаваў «Глабальны рэйтынг канкурэнтаздольнасці» на 2011—2012 гады. У спісе 142 краіны, узначальвае яго Швейцарыя. Апошнія месцы занялі Чад, Гаіці, Бурундзі, Ангола. Беларусі ў гэтым спісе ўвогуле няма…**

### Пляма

*Як пра нас магла забыцца*
*Міжнародная гурма?*
*Беларусі нашай быццам*
*І на глобусе няма.*
*Там, дзе мы, — нібыта гола,*
*Ці пустыня акурат.*
*Ды затое ёсць Ангола,*
*І Бурундзі ёсць, і Чад.*
*Не шыкоўнае, вядома,*
*Але там жыццё ідзе.*
*Там улада пакрыёма*
*Нешта робіць для людзей.*
*Хай там кожны голы-босы,*
*А ў сухмень бывае мор,*
*Ды збіраюць там какосы*
*І бананы з даўніх пор.*

*Там вядзецца бізнес нейкі,*
*Экспарт-імпарт існуе.*
*Пэўна ж, маюць не «капейкі»*
*Там за «фінікі» свае.*
*І пакуль што хай Бурундзі*
*Тога рэйтынгу ў хвасце,*
*Ды ўсё лепей жыцьмуць людзі,*
*З часам рэйтынг падрасце.*
*І ўсё меней будзе скрухі*
*У Бурундзі што ні год,*
*Бо інвестары, як мухі,*
*Паляцяць туды на «мёд».*
*Дык чаму краіна наша*
*У канкурэнтнай барацьбе,*
*Мовіць так, каля парашы*

*Месца выбрала сабе?*
*І чаму к нам дабрадзеі*
*З-за кардону не прыйшлі?*
*Бо нямашка ў іх надзеі*
*На «драўляныя» рублі.*
*Сумняваецца інвестар:*
*Зарабіўшы тут мільён,*
*Гэтых «зайчыкаў» заместа*
*Мецьме пяць даляраў ён.*
*І пакуль ляцім мы ў яму,*
*Выжываючы ледзь-ледзь,*
*Там, дзе нам жывецца,*
*Пляму*
*Бізнес-глобус будзе мець.*

**Алесь Няўвесь.**

**Заснавальнік:** Сяржук Салодкі
**Рэдактар:** Аляксандр Шчамлёў
**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы.
Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742
**Наклад:** 290 асобнікаў.
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна